*УДК 72.03 (476)*
***Малікаў Я.Р., БелДУТ, Гомель***

# ГІСТОРЫКА-АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА ЦЭНТРАЛЬНАГА ПАЛЕССЯ – ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАННЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ (НА ПРЫКЛАДЗЕ г. ТУРАВА)

Цэнтральнае Палессе – геаграфічны тэрмін, які азначае тэрыторыю, што знаходзіцца на памежжы Гомельскай і Брэсцкай абласцей, этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі Усходняе і Заходняе Палессе. Дадзеная тэрыторыя лакалізуецца ўздоўж рэчышча Гарыні, на лініі Тураў-Давід-Гарадок-Столін, дасягаючы на захадзе Пінскага раёна, на ўсходзе – Лельчыцкага і Жыткавіцкага раёнаў.

Важнейшым старажытным эканамічным, палітычным і культурным цэнтрам на гэтай тэрыторыі з'яўляецца г.Тураў. Дзякуючы свайму гістарычнаму мінуламу, ён уваходзіць у турыстычны маршрут "Залатое кола Гомельшчыны". Аднак

сёння мала што нагадвае ў Тураве аб яго былой велічы – старажытнае гарадзішча з падмуркамі храма XII ст., царква Усіх Святых (1810 г.), тураўскія каменныя крыжы – цудадзейныя святыні, мясцовы краязнаўчы музей. Зусім іншы Тураў адкрываецца падчас карпатлівага абыходу яго старых вулачак, дзе яшчэ захавалася некалькі дзесяткаў старых хат канца XIX – першай паловы XX ст. з унікальным разьбяным дэкорам. Фактычна гэта вялізны, абсалютна невядомы ні мясцовым уладам, ні тым больш тураператарам, і нікім не задейнічаны турыстычны патэнцыял – традыцыйнае дойлідства. Традыцыйнае дойлідства Турава – гэта ў значнай меры канцэнтрацыя лакальных асаблівасцей архітэктуры ўсяго Цэнтральнага Палесся, своеасаблівасць якой ярка заўважна ў параўнанні з народнай архітэктурай з іншых тэрыторый Беларусі.

Характарызуючы ў цэлым драўляны разьбяны архітэктурны дэкор народнага дойлідства Цэнтральнага Палесся, варта адзначыць, што ён адыгрывае важную ролю ў стварэнні вобраза жылля, пластычна ўдакладняючы тэктоніку і мастацкае значэнне канструктыўных элементаў, кантрастна супрацьпастаўленых на фоне выразна плоскастных асноўных частак хаты. Гэта добра бачна ў скульптурнай апрацоўцы вуглоў "з астаткам", кансолей, выступаючых канцоў вільчыкаў, кроквáў, трама, надаконнікаў, а таксама шул у брамах і інш., на фоне пласкасцей сцен, франтонаў, навясных варот.

Аднак гэтая малавядомая частка старажытнай спадчыны Турава, нажаль, нікім не выкарыстоўваецца як турыстычны патэнцыял, і бясследна знікае. Адзінае выйсце – стварэнне ў Тураве на базе яшчэ захаванай старой забудовы музея народнай архітэктуры Цэнтральнага Палесся пад адкрытым небам – скансэна. Ён зможа аб'яднаць ў адзіны лагічны комплекс існуючыя ў гэтым горадзе старажытныя помнікі і стане яркім адлюстраваннем народнага дойлідства ўсяго гэтага рэгіёна.